# «ПАСТУПАЕМ У ЛІЦЭЙ ВДУ»

***Пад такой назвай 19 лютага ў нашым універсітэце адбылася інфармацыйная экскурсія для абітурыентаў Ліцэя. Больш за 100 школьнікаў 7 – 9 класаў разам са сваімі бацькамі і педагогамі з навучальных устаноў Віцебска, Полацка і Віцебскага раёна прыехалі ў ВДУ, каб бліжэй пазнаёміцца з прапанаванымі профілямі навучання.***






Для гасцей была арганізавана сустрэча з рэктарам універсітэта. У сваім выступленні Валянціна Багатырова, доктар эканамічных навук, прафесар, расказала прысутным аб асаблівасцях паступлення, педагогах Ліцэя, матэрыяльна-тэхнічным абсталяванні кабінетаў і лабараторый, дзе будуць праводзіцца як навучальныя, так і факультатыўныя заняткі.

«Ліцэй ВДУ імя П.М. Машэрава для мяне – гэта мара, якая, я спадзяюся, хутка здзейсніцца. Заняткі для ліцэістаў будуць праводзіць высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія на працягу многіх гадоў паспяхова працуюць з таленавітай моладдзю рэгіёна. Прафесарска-выкладчыцкі склад у нас вельмі рэйтынгавы. Я перакананая ў тым, што вучыцца ў нас будзе цікава. Спадзяюся, што пасля заканчэння навучання ў нашым Ліцэі, маладыя людзі вырашаць паступаць ва ўніверсітэты Віцебшчыны», – адзначыла Валянціна Васільеўна.

Затым перад прысутнымі выступілі дэканы ФГіМК, ФХБіГН, ФМіІТ, пасля чаго школьнікі атрымалі магчымасць пазнаёміцца з нашым універсітэтам і на свае вочы ўбачыць вучэбныя аўдыторыі, найноўшыя лабараторыі, паўдзельнічаць у хімічных доследах, пагрузіцца ў свет віртуальнай рэальнасці, наведаць Біялагічны музей і Цэнтр кітайскай мовы...

**Васіліна КАЗЛОВА, вучаніца 9 класа сярэдняй школы № 1 г.п. Лёзна:**

«Пра Ліцэй ВДУ я даведалася ў сваёй школе. Мне стала цікава, таму я вырашыла прыехаць у Віцебск. Экскурсія мне спадабалася, хочацца адзначыць даступны і зразумелы выступ рэктара, а таксама цікавы ўрок англійскай мовы. Для навучання разглядаю гуманітарны профіль, бо ў будучыні хачу стаць тэлевядучай і працаваць на тэлебачанні».

**Мікіта ЛІСОЎСКІ, вучань 9 класа гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны г. Полацка:**

«Я даведаўся пра Ліцэй праз прафарыентацыйную экскурсію ў г. Віцебск, якую нам прапанаваў наш класны кіраўнік. Мне больш за ўсё спадабалася лабараторыя IT і метадаў навучання хіміі. Мяне цікавіць хіміка-біялагічны профіль: у будучым я хачу працаваць на фармацэўтычным прадпрыемстве, бо лічу, што лекавая прамысловасць будзе актыўна развівацца і надалей».

**Варвара НІКАЛАЕВА, вучаніца 9 класа сярэдняй школы № 46 імя І.Х. Баграмяна г. Віцебска:**

«Пра Ліцэй ВДУ мне расказаў мой класны кіраўнік. Падчас экскурсіі мне вельмі спадабаліся робаты, дрон, акуляры віртуальнай рэальнасці і інш. У будучыні хачу стаць інжынерам, таму выбіраю фізіка-матэматычны профіль. Фізіка і матэматыка – мае любімыя прадметы».

Як адзначыла **Наталля Маркіна, сакратар прыёмнай камісіі Ліцэя**, важнасць інфармацыйнай экскурсіі ў тым, што падчас гэтага мерапрыемства будучыя ліцэісты атрымалі адказы на тыя пытанні, якія іх цікавілі, і змаглі вызначыцца з профілем, на які будуць паступаць.

«Навучанне ў Ліцэі адкрывае для школьнікаў новыя магчымасці: паглыбленае вывучэнне прадметаў па профілях, далучэнне да студэнцкага жыцця і навуковай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцяў, новыя знаёмствы, рэалізацыя свайго патэнцыялу», – падагульніла Наталля Аляксандраўна.

**Вікторыя ЧАКУШКА.**
**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота – і відэарэпартаж з мерапрыемства глядзіце з дапамогай QR-кода.